Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
______________Ю. П. Бондар
«____»_____________2013 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____ /вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРАГРАМА
# ВУЧЭБНАЙ І ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫКІ

*па спецыяльнасці 1-21 04 01 Культуралогія,*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-01 Культуралогія (фундаментальная), спецыялізацыі 1-21 04 01-01 01 Тэорыя і гісторыя культуры*

Мінск
БДУКМ
2013

**Складальнікі:**

*І. М. Варановіч,* выкладчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі;

*А. А. Спірына,* старшы выкладчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі

**Рэцэнзенты:**

*У. Ф. Мартынаў,* загадчык кафедры культуралогіі прыватнай установы адукацыі «Інстытут сучасных ведаў імя А. М. Шырокава», доктар культуралогіі, прафесар;

*В. У. Сашчэка,* дацэнт кафедры тэатральнай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

кафедрай культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 29.01.2011 г.);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 24.05.2011 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю *В. Б. Кудласевіч*
Адказны за выпуск *А. А. Спірына*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Практыка скіравана на азнаямленне, вывучэнне і практычнае засваенне шэрагу відаў выкладчыцкай і навуковай дзейнасці. Яна звязвае тэарэтычныя веды з практыкай і прафесійным развіццём. Студэнты паэтапна авалодваюць прыёмамі практычнага выкарыстання ведаў, атрыманых падчас заняткаў па культуралагічных дысцыплінах, шэрагам даследчых методык па тэхналогіі навучання, праводзяць самастойныя даследаванні, вынікі якіх уключаюцца ў склад курсавых, дыпломных і навуковых работ. Практыка дапамагае вызначыць і развіць свае схільнасці да выкладчыцкай ці навукова-даследчай работы, уплываючы на выбар будучай прафесіі.

Праграма распрацавана ў адпаведнасці з Кодэксам аб адукацыі Рэспублікі Беларусь, адукацыйным стандартам Рэспублікі Беларусь 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках) і пастановай Савета Міністраў № 860 ад 03.06.2010 г.

Практыка ажыццяўляецца на працягу 2–4 курсаў, носіць сістэматычны і інтэгратыўны характар. Складаецца з 3 этапаў, кожны з якіх паслядоўна ўводзіць студэнта ў сутнасць будучай прафесіі:

1. Азнаямленчая практыка – 4 семестр, 2 тыдні.
2. Педагагічная практыка – 6 семестр, 3 тыдні.
3. Пераддыпломная практыка – 7 семестр, 4 тыдні.

*Мэта* практыкі – замацаваць тэарэтычныя веды і набыць практычныя навыкі ў рабоце па спецыяльнасці (навукова-даследчай, адміністратыўна-кіраўніцкай і праектна-аналітычнай, а таксама педагагічнай дзейнасці ў сферы культуры).

*Задачамі* практыкі з’яўляюцца:

– фарміраванне ведаў, уменняў і навыкаў работы па спецыяльнасці;

– развіццё педагагічнага майстэрства, умення навучаць і выхоўваць;

– развіццё арганізатарскіх здольнасцей, умення працаваць з людзьмі, кіраваць;

– развіццё здольнасцей да навукова-даследчай працы, умення аналізаваць, ствараць новае;

– пашырэнне сувязей вуза з арганізацыямі і ўстановамі, якія працуюць у сферы адукацыі і культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У выніку выканання праграмы практыкі студэнты павінны *ўмець*:

– аналізаваць, планаваць і ажыццяўляць даследчую і педагагічную дзейнасць культуролага і выкладчыка;

– аналізаваць гісторыка-культурную спадчыну Беларусі.

*Валодаць* навыкамі:

– навукова-даследчай дзейнасці ў галіне культуралогіі;

– прафесійных зносін з навучэнцамі, якія маюць розныя ўзроставыя, прафесійныя і псіхалагічныя характарыстыкі.

У якасці баз практыкі будучых выкладчыкаў культуралагічных дысцыплін і культуролагаў-даследчыкаў выступаюць:

– агульнаадукацыйныя школы і спецыялізаваныя сярэднія навучальныя ўстановы, дзе выкладаюцца курсы «Гісторыя Беларусі», «Чалавек. Грамадства. Дзяржава» і іншыя культуралагічныя дысцыпліны, а таксама курсы «Сусветная мастацкая культура» («Свет культуры») і інш.;

– разнастайныя ўстановы культуры;

– навукова-даследчыя ўстановы;

– установы, якія спалучаюць у сваёй дзейнасці навуковадаследчую і вучэбна-метадычную работу.

Змест практыкі дазволіць забяспечыць пераемнасць паміж асобнымі відамі практыкі і вырашыць шэраг сутнасных задач падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне культуры ў Рэспубліцы Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ПРАКТЫКІ

## Азнаямленчая практыка

**2 курс, 4 семестр**

Практыка пачынаецца на 2 курсе ў 4 семестры і яе базамі з'яўляюцца ўстановы культуры і ўстановы адукацыі.

*Мэта* практыкі – азнаямленне і вывучэнне існуючых форм педагагічнай дзейнасці і культурна-асветніцкай работы навучальных устаноў і ўстаноў культуры, з асноўнымі культурнымі помнікамі архітэктуры і мастацтва.

*Задачы:*

1. Вывучэнне структуры і функцый вядучых бібліятэк Беларусі і набыць навыкі выкарыстання ДБА бібліятэкі ў навукова-даследчых мэтах.
2. Вывучэнне гісторыі, структуры і функцый ІМЭіФ пры НАН Беларусі і работы Музея старажытнабеларускай культуры.
3. Даследаванне спецыфікі ўстановы адукацыі «Інстытут культуры Беларусі».
4. Вылучэнне агульнага і адметнага ў дзейнасці разнастайных інстытутаў у галіне культуры.
5. Аналіз тэатральных спектакляў.
6. Аналіз гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.

*У змест практыкі ўваходзіць:*

1. Знаёмства з дакументамі аб гісторыі стварэння, структурай і функцыямі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Вывучэнне праграм навукова-інфармацыйнай і навукова-даследчай дзейнасці бібліятэкі, наведванне музеяў. Асваенне выкарыстання ДБА бібліятэкі ў навукова-даследчых і педагагічных мэтах.
2. Знаёмства з гісторыяй, структурай і функцыямі ІМЭіФ пры НАН Беларусі. Падрабязнае знаёмства са спецыфікай работы аддзела старажытнабеларускай культуры і асноўнымі вынікамі яго дзейнасці. Знаёмства з экспазіцыяй Музея старажытнабеларускай культуры, праца ў бібліятэцы музея. Арганізацыя экскурсіі па асноўнай экспазіцыі музея.
3. Знаёмства з гісторыяй, структурай і функцыямі ўстановы адукацыі «Інстытут культуры Беларусі», работай яго аддзелаў і лабараторый, асноўнымі рэзультатамі дзейнасці. Асаблівасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі спецыялістаў у галіне культуры і мастацтва на базе інстытута. Наведванне лекцый.

4. Абагульненне матэрыялу, атрыманага на базах практыкі і падрабязны аналіз асаблівасцей дзейнасці разнастайных інстытутаў у галіне культуры.

5. Наведванне тэатральных спектакляў, іх аналіз. Публічнае абмеркаванне.

## Педагагічная практыка

**3 курс, 6 семестр**

Педагагічная практыка можа ажыццяўляцца па некалькіх асноўных кірунках (педагагічны і даследчы) у адпаведнасці з кампетэнцыямі спецыяльнасці.

*Мэта* практыкі – развіццё здольнасцей да навукова-даследчай працы, аналіз дзейнасці выкладчыкаў, развіццё арганізатарскіх здольнасцей і педагагічных навыкаў пры правядзенні экскурсій для вучняў сярэдніх школ раёнаў і студэнтаў кафедры культуралогіі.

*Задачы:*

1. Вывучэнне структуры і функцый, задач, асаблівасцей вучэбнага і выхаваўчага працэсаў ва ўстановах адукацыі.

2. Засваенне асноў выкладання культуралагічных прадметаў ва ўстановах адукацыі.

3. Аналіз методыкі і тэхналогіі выкладання культуралагічных дысцыплін.

4. Правядзенне даследчай работы па падрыхтоўцы навуковага матэрыялу культуралагічнай спецыфікі для вучняў рознага ўзросту.

5. Самастойнае правядзенне часткі экскурсіі для рознаўзроставых дзяцей.

6. Арганізацыя выхаваўчай і факультатыўнай работы з навучэнцамі.

7. Аналіз гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі пры дапамозе экскурсій па тэрыторыі Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*У змест практыкі ўваходзіць:*

1. Знаёмства з дакументамі, якія адлюстроўваюць спецыфіку дзейнасці ўстаноў адукацыі, асноўныя задачы і структуру; аналіз дакументаў аб пабудове вучэбнага і выхаваўчага працэсаў.

2. Аналіз методыкі і тэхналогіі выкладання прадметаў, якія маюць дачыненне да культуралагічнай праблематыкі.

3. Распрацоўка плана-канспекта ўрока, падрыхтоўка навукова-даследчага матэрыялу і правядзенне пробнага ўрока або яго фрагмента.

4. Аналіз і сінтэз навукова-даследчых прац культуралагічнага кірунку, і як вынік, распрацоўка зместу экскурсіі.

5. Правядзенне падрыхтоўкі да вызначанай часткі экскурсіі (вызначэнне мэты і зместу, падбор метадаў і прыёмаў, складанне тэматычнага плана-канспекта, выкарыстоўванне наглядных дапаможнікаў і г.д.).

6. Правядзенне пробнага фрагмента гуртковага занятку па гісторыка-культуралагічным напрамку: падбіраецца навуковая, метадычная і педагагічная літаратура, дыдактычныя матэрыялы, ТСН, распрацоўваюцца схемы, табліцы, карты, альбомы, тэсты, заданні для арганізацыі самастойнай работы навучэнцаў, кантроль за засваеннем ведаў. У інфармацыйным цэнтры БДУКМ студэнты рыхтуюць матэрыялы ў выглядзе вучэбна-метадычнага дапаможніка (відэапрэзентацыі), выкарыстоўваючы магчымасці праграмы Power Point, якія затым выкарыстоўваюць падчас правядзення занятку.

## Пераддыпломная практыка

**4 курс, 7 семестр**

*Мэта* практыкі – засваенне і замацаванне ведаў і ўменняў студэнтаў, атрыманых ва УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» па ўсім курсе навучання, праверка магчымасцей самастойнай працы будучага спецыяліста ва ўмовах пэўнай педагагічнай і навукова-даследчай дзейнасці, падрыхтоўка матэрыялаў да дыпломнага праекта ў працэсе экскурсій па гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*У змест практыкі ўваходзіць:*

1. Аваладанне навыкамі і ўменнямі працы ў якасці выкладчыка культуралагічных дысцыплін, культуролага-даследчыка. Выкананне асноўнай працы культуралагічнага ўтрымання.

2. Выкананне практычнай часткі дыпломнага праекта.

3. Правядзенне лекцыйных заняткаў розных тыпаў з выкарыстаннем разнастайных метадаў і прыёмаў. Напісанне планаў-канспектаў лекцый. Рацыянальнае выкарыстанне часу на лекцыі, выкарыстанне сродкаў ТСН, актыўнае ўцягванне студэнтаў у навучальны працэс на ўсіх этапах заняткаў.

4. Арганізацыя кантролю над самастойнай працай студэнтаў. Распрацоўка плана работы са студэнтамі, якія дрэнна засвойваюць матэрыял, арганізацыя з імі індывідуальнай працы.

5. Прыцягненне студэнтаў да навукова-даследчай працы, рэкамендацыя лепшых навуковых прац студэнтаў да ўдзелу ў канферэнцыях па культуралагічных дысцыплінах.

6. Складанне і выкарыстанне навучальнай і метадычнай літаратуры па культуралогіі і дысцыплінах культуралагічнага цыкла.

7. Замацаванне ўсяго комплексу ведаў па дысцыплінах вузкай спецыялізацыі ў адпаведнасці з абраным кірункам, збор і абагульненне інфармацыі па тэме дыпломнай працы; апрацоўка напрацовак і галоўных вынікаў дыпломнай працы.

8. Ажыццяўленне экскурсій па Беларусі з мэтай пошуку матэрыялаў для дыпломнай працы.

9. Асноўны вынік пераддыпломнай практыкі павінен стаць асновай напісання выпускной дыпломнай працы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Парадак правядзення практыкі

Практыка пачынаецца з агульнага знаёмства студэнтаў з базавай установай, яе структурай, а таксама формамі і метадамі дзейнасці яе падраздзяленняў і аддзелаў. Студэнты знаёмяцца з кіраўнікамі і супрацоўнікамі базавай установы, вучнямі і навучэнцамі, замацоўваюцца за пэўным кіраўніком.

На працягу першага тыдня практыкі студэнты з удзелам кіраўніка практыкі ад кафедры ўніверсітэта складаюць індывідуальныя планы на ўвесь тэрмін практыкі, якія зацвярджаюцца кіраўніком практыкі БДУ культуры і мастацтваў. Падчас практыкі студэнты сустракаюцца з завучам навучальнай установы, даведваюцца пра арганізацыю вучэбнага і выхаваўчага працэсаў, а таксама аб методыцы правядзення ўрока і яго аналізу. Яны наведваюць урокі (лекцыі) настаўнікаў (выкладчыкаў) па культуралогіі і культуралагічных дысцыплінах, сусветнай мастацкай культуры, назіраюць і аналізуюць урокі (лекцыі). Рыхтуюць асабістыя выступленні ў рамках грамадскай работы навучальных устаноў, урокі (лекцыі), удзельнічаюць у пазашкольнай рабоце. Студэнты наведваюць бібліятэкі, дзе знаёмяцца з іх структурай і дзейнасцю, даведачным апаратам, вучацца падбіраць літаратуру па тэме даследавання і працаваць з ёй. Таксама студэнты знаёмяцца са структурай і дзейнасцю разнастайных устаноў культуры і навукова-даследчых устаноў, асноўнымі вынікамі іх дзейнасці. Студэнты выконваюць разнастайныя заданні, звязаныя з іх будучай прафесійнай дзейнасцю.

Кафедра культуралогіі не толькі кантралюе наведванне практыкі ў навучальных установах і ўстановах культуры, але і дапамагае студэнтам падчас праходжання практыкі. Штодзень кіраўнік практыкі ад кафедры наведвае базы практыкі, гутарыць са студэнтамі, падводзіць вынікі дня, дапамагае ў вырашэнні складаных пытанняў. Пасля заканчэння практыкі па яе выніках праводзіцца канферэнцыя, на якой кожнаму студэнту выстаўляецца ацэнка па практыцы. Падчас канферэнцыі студэнты выступаюць са справаздачамі па выкананай рабоце, дзеляцца набытым у навучальных установах і ўстановах культуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вопытам, паведамляюць пра свае заўвагі і прапановы наконт праходжання практыкі.

У перыяд праходжання практыкі студэнт павінен весці дзённік практыкі, да якога абавязкова прыкладаюцца матэрыялы індывідуальнай работы студэнтаў. Іх аб'ём і якасць улічваюцца пры падвядзенні вынікаў практыкі, аказваюць уплыў на ацэнку работы практыканта. Лепшыя работы могуць быць прадстаўлены да рэспубліканскага конкурсу НДРС.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Абавязкі студэнтаў-практыкантаў

1. Студэнт-практыкант выконвае ўсе віды работ, якія прадугледжаны праграмай.

2. Студэнт-практыкант падпарадкоўваецца правілам унутранага распарадку работы ўстановы адукацыі і культуры, распараджэннем арганізатараў і кіраўнікоў практыкі.

3. Студэнту-практыканту, недапушчанаму да практыкі, або студэнту, работа якога па педагагічнай практыцы прызнана нездавальняючай, па рашэнні савета факультэта культуралогіі і СКД прызначаецца паўторнае праходжанне практыкі без адрыву ад заняткаў ва ўніверсітэце.

4. Ацэнкі, атрыманыя па выніках праходжання практыкі, уваходзяць у агульную паспяховасць студэнтаў.

## Дакументацыя, улік і ацэнка практыкі студэнтаў

1. Студэнты-практыканты падчас практыкі вядуць дзённік, у які занатоўваюць назіранні за працэсамі навучання і выхавання на ўроках і пазакласнай дзейнасці, заўвагі і даручэнні выкладчыкаў і кіраўнікоў практыкі, а таксама даныя пра выкананне праграмных заданняў. Дзённік выкарыстоўваецца для справаздачы аб выніках праходжання практыкі.

2. Па заканчэнні кожнага віду практыкі студэнты прадстаўляюць наступную дакументацыю:

– пратакол назіранняў урокаў, экскурсій, канцэртаў, спектакляў;

– пратакол праведзенага ўрока (адкрытага ўрока) ці пазакласнага мерапрыемства з заключэннем кіраўніка практыкі;

– канспект, план і аналіз выхаваўчага мерапрыемства, праведзенага з навучэнцамі;

– псіхолага-педагагічную характарыстыку асобы навучэнца з ліку вучняў таго класа, у якім выконваліся асноўныя даручэнні па практыцы;

– план-канспект аднаго з распрацаваных студэнтам-практыкантам урокаў з падабранымі да яго нагляднымі дапаможнікамі;

– вынікі творчай работы;

– справаздачу аб праведзенай рабоце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Абмеркаванне вынікаў практыкі праводзіцца ў форме калёквіуму або канферэнцыі.

4. Найбольш значныя, навукова абгрунтаваныя вынікі практыкі могуць быць вынесены для абмеркавання сярод студэнцкай аўдыторыі, на студэнцкай навуковай канферэнцыі ўніверсітэта.

5. Па выніках усіх відаў практыкі з улікам праведзенай дакументацыі студэнт атрымлівае залік на 2 курсе, на 3 і 4 курсах – дыферэнцыраваны залік.

## Абавязкі кіраўнікоў практыкі

*Кіраўнік практыкі ад прадпрыемства:*

– знаёміць студэнтаў з планам сваёй работы;

– сумесна з выкладчыкамі ўніверсітэта размяркоўвае паміж студэнтамі заданні практыкі;

– кансультуе студэнтаў пры падрыхтоўцы да правядзення ўрокаў і пазакласных заняткаў, правярае канспекты, планы ўрокаў і пазакласных заняткаў, дае згоду на допуск студэнтаў да заняткаў;

– удзельнічае ў працэсе аналізу і ацэнкі ўрокаў, пазакласных заняткаў, праведзеных студэнтамі.

*Кіраўнік практыкі ад кафедры ўніверсітэта:*

– арганізуе наведванне студэнтамі ўрокаў (лекцый) у навучальных установах, а таксама пазакласных заняткаў культуралагічнага цыкла і праводзіць іх аналіз;

– сумесна з іншымі кіраўнікамі практыкі ўдзельнічае ў наведванні ўстаноў культуры, наладжвае аналіз методыкі іх культуралагічнай і педагагічнай дзейнасці;

– кансультуе студэнтаў у час падрыхтоўкі іх да правядзення пазакласных заняткаў культуралагічнага кірунку;

– правярае і зацвярджае планы, канспекты ўрокаў, падрыхтаваных студэнтамі, прысутнічае на ўроках і пазакласных мерапрыемствах культуралагічнага профілю;

– аказвае навукова-метадычную дапамогу настаўнікам школы ў наладжванні кантактаў са студэнтамі;

– арганізуе правядзенне ўстановачнай і выніковай канферэнцый па комплекснай практыцы і ацэнцы кожнага студэнта.

Падчас праходжання практыкі кафедра пастаянна аказвае дапамогу студэнтам у выглядзе кансультацый па складаных пытаннях вучэбнай, выхаваўчай і даследчай работы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Літаратура


1. *Айчынная* і сусветная мастацкая культура : праграма практыкі студэнтаў / распрац. В. А. Грачова, С. В. Хрол. – Мінск : БДУ культуры і мастацтваў, 2005. – 20 с.

2. *Волкович, Н. А.* Методика преподавания мировой и отечественной художественной культуры : пособие / Н. А. Волкович, Н. Н. Беспамятных, Н. Б. Журавлева ; под общ. ред. У. Д. Розенфельда. – Гродно : ГрГУ, 2002. – 117 с.

3. *Волкович, Н. А.* Педагогическая практика по мировой и отечественной художественной культуре : пособие / Н. А. Волкович, Н. Н. Беспамятных, Н. Б. Журавлева ; под общ. ред. У. Д. Розенфельда. – Гродно : ГрГУ, 2002. – 59 с.

4. *Гин, А. А.* Приемы педагогической техники / А. А. Гин. – Гомель : ИПП «Сож», 1999. – 123 с.

5. *Ершова, А. П.* Режиссура урока, общения и поведения учителя / А. П. Ершова. – М. : Воронеж, 1995. – 265 с.

6. *Конаржевский, Ю. А.* Анализ урока / Ю. А. Конаржевский. – М. : Педагогический поиск, 1999. – 135 с.

7. *Копылова, А. В.* Планирование уроков по мировой художественной культуре / А. В. Копылова. – М. : Аз, 1999. – 246 с.

8. *Методические* рекомендации для преподавания мировой художественной культуры : пособие для учителя; под науч. ред. Л. М. Предтеченской. – М. : ООО «Фирма МХК», 2000. – 198 с.

9. *Об утверждении* положения о производственной практике студентов высших учебных заведений Республики Беларусь // Постановление Совета Министров Республики Беларусь 30.11.2000 № 1823 (в ред. постановления Совмина от 02.05.2003 № 595).

10. *Селевко, Г. К.* Современные образовательные технологии : учеб. пособие / Г. К. Селевко. – М. : Нар. образование, 1998. – 213 с.

11. *Хуторской, А. В.* Дидактическая эвристика. Теория и технология креативного обучения / А. В. Хуторской. – М. : Изд-во МГУ, 2003. – 456 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ДАДАТКІ

*Дадатак 1*

## Схема назірання ўрока (лекцыі)

Горад…….., навучальная ўстанова.........., клас (курс, група)......
Настаўнік……………
Дата…………………...
Тэма…………………..
Выкарыстанне разнастайных сродкаў: падручнікі і дапаможнікі, наглядныя і аўдыявізуальныя сродкі, запісы на дошцы і інш.

Схема ўрока

| Час (хронаметраж урока) | Дзейнасць настаўніка | Дзейнасць навучэнцаў | Каментарыі |
|---|---|---|---|
| | | | |

*Параметры, якія патрэбна вызначыць у выніку назірання:*

– узроставыя характарыстыкі асобы навучэнцаў,
– мэта ўрока,
– тып урока і яго месца ў засваенні тэмы,
– выкарыстаныя метады і прыёмы,
– узаемасувязь мэты, зместу і методыкі выкладання вучэбнай тэмы,
– характар і прадуктыўнасць хатніх заданняў,
– абгрунтаванасць прыёмаў кантролю і ацэнак,
– педагагічнае майстэрства выкладчыка,
– характар узаемадзеяння выкладчыка і навучэнцаў у працэсе ўрока,
– выкананне дыдактычных, выхаваўчых і развіццёвых задач урока,
– шляхі ўдасканалення педагагічнай дзейнасці выкладчыка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатак 2*

## Асноўныя тыпы і віды аналізу ўрока (па М. І. Махмутаву)

Вылучаюць тыпы аналізу ўрокаў.

**Дыдактычны аналіз** мяркуе аналіз урока па асноўных дыдактычных катэгорыях (пастаноўка мэты ўрока, выкананне дыдактычных прынцыпаў, логікі навучальнага матэрыялу, логікі працэсу навучання, ужыванне метадаў і сродкаў навучання, пытанні актывізацыі пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў, арганізацыі іх самастойных прац, рэалізацыі прынцыпаў адукацыі і выхавання).

**Псіхалагічны аналіз** мяркуе вывучэнне псіхалагічнага клімату на ўроку, адносін паміж настаўнікам і навучэнцамі, адносін паміж навучэнцамі, пытанняў педагагічнага такту настаўніка, ступені яго асабістага ўплыву на навучэнцаў.

**Выхаваўчы аналіз** праводзіцца з мэтай вывучэння ступені выхаваўчага ўздзеяння ўрока на навучэнцаў.

**Метадычны аналіз** урока прадугледжвае вывучэнне дзейнасці настаўніка і навучэнцаў, іх узаемадзеянне падчас урока.

**Аналіз арганізацыйнага аспекту** ўрока прадугледжвае вывучэнне прыёмаў арганізацыі заняткаў, ступень абсталяванасці ўрока рознымі дапаможнікамі, эфектыўнасць выкарыстання ТСН на ўроку, вядзенне настаўнікам дакументацыі, рацыянальнасць выкарыстання часу на ўроку, выкананне санітарна-гігіенічнага рэжыму і г.д.

**Паэтапны аналіз урока.** Паэтапны аналіз урока – падчас назірання спадарожнае каментаванне ходу ўрока. Самааналіз і аналіз урока ажыццяўляецца па адной схеме: пачатак урока, тлумачэнне яго мэт, паўтор, псіхалагічная падрыхтоўка да засваення новага матэрыялу, яго выкладанне, замацаванне, хатняе заданне, ацэнка адказаў вучняў. Аналіз урока завяршаецца агульнай ацэнкай поспехаў і няўдач, парадамі па паляпшэнні прыёмаў і спосабаў правядзення асобных элементаў урока.

**Дыдактычны аналіз урока:**

1. *Агульная структура:*

– прынцыпы арганізацыі навучальнай дзейнасці;
– асноўная дыдактычная мэта і задачы;
– тып урока, яго месца ў сістэме ўрокаў;
– асноўныя элементы (пачатак, асноўны этап, заканчэнне);
– эфектыўнасць выкарыстання часу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*2. Рэалізацыя асноўнай дыдактычнай мэты:*

– выкананне патрабавання праграмы;

– суадносіны выкладзенага матэрыялу і самастойнай працы навучэнцаў;

– арганізацыя першаснага замацавання;

– праверка якасці ведаў, уменняў, навыкаў;

– ахоп навучэнцаў навучальнай працай.

*3. Развіваючая функцыя:*

– уцягванне навучэнцаў ва ўдасканаленне асноўных разумовых аперацый (аналіз, параўнанне, абагульненне, класіфікацыя, сістэматызацыя);

– развіццё пазнавальнай самастойнасці;

– развіццё творчага мыслення;

– паведамленне інфармацыі для агульнага развіцця.

*4. Выхаваўчая функцыя:*

– выкарыстанне выхаваўчых магчымасцей, зместу навучальнага матэрыялу;

– прылучэнне да агульначалавечых каштоўнасцей;

– практычная скіраванасць, улік інтарэсаў;

– выхаванне добрасумленнага стаўлення да навучальнай працы;

– улік выхаваўчай функцыі ацэнкі.

*5. Метады і сродкі навучання:*

– метады ўводзін новага матэрыялу (тлумачэнне, аповед, лекцыя, гутарка, дэманстрацыі і інш.);

– метады кантролю (індывідуальны, франтальны, камбінаваны, узаемакантроль, методыка праверкі хатняга задання);

– метады выпрацоўкі і замацавання ўменняў і навыкаў (гутарка, пісьмовыя ці вусныя практыкаванні, праца з падручнікам);

– інавацыйныя метады.

*6. Праца з вучнямі:*

– падрыхтаванасць вучняў да ўрока;

– актыўнасць вучняў на розных этапах урока;

– віды дзейнасці;

– культура працы, дысцыпліна;

– стаўленне да прадмета, да настаўніка;

– дынаміка працаздольнасці, моманты яе найвялікшай актыўнасці, спаду, іх вынікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Камбінаваная схема аналізу ўрока:**

*1. Агульныя звесткі пра ўрок:*

– дата, клас, прадмет, колькасць навучэнцаў па спісе, колькасць прысутных, нумар урока па парадку;

– становішча ў класе; чысціня, асветленасць памяшкання, ці выветрана памяшканне, парадак у класе, гатоўнасць навучэнцаў да ўрока;

– абсталяванне; падрыхтаванасць дапаможнікаў, іх мэтазгоднасць і неабходнасць на ўроку;

– арганізацыйны пачатак урока;

– тэма ўрока, мэты ўрока (фармуляванне навучэнцам мэт і задач урока).

*2. Тып і структура ўрока:*

– тып урока: мэтазгоднасць яго выбару з пункта гледжання тэмы ў цэлым і дыдактычнай мэты занятку; месца ўрока ў сістэме заняткаў;

– сувязь урока з папярэднім: як яна ажыццяўлялася;

– структура ўрока: ці адпавядае яна дадзенаму тыпу ўрока;

– паслядоўнасць асобных этапаў урока; забеспячэнне цэласнасці і завершанасці ўрока;

– асаблівасці падвядзення вынікаў урока.

*3. Утрыманне ўрока:*

– адпаведнасць утрымання праграме;

– сувязь навучальнага матэрыялу з сучаснасцю, мясцовым асяроддзем школы;

– усталяванне міжпрадметных сувязей;

– метады і формы фарміравання працавітасці;

– асаблівасці развіцця інтэлектуальных здольнасцей, маральных і эстэтычных пачуццяў у навучэнцаў;

– выкарыстанне дыдактычных матэрыялаў і абсталявання кабінета;

– узровень росту ці ўдасканаленне навыкаў, ведаў і ўменняў на аснове засвоенага матэрыялу.

*4. Метады і прыёмы навучання на ўроку:*

– выкарыстоўванне сістэмы метадаў і прыёмаў, іх спалучэнне;

– адпаведнасць метадаў і прыёмаў зместу матэрыялу, тыпу, мэтам, задачам урока і ўзроставым асаблівасцям навучэнцаў;

– выкананне асноўных патрабаванняў да ўрока;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– асаблівасці развіцця на ўроку назіральнасці і лагічнага мыслення навучэнцаў;

– асаблівасці самастойнай працы навучэнцаў;

– фарміраванне ў школьнікаў умення вучыцца;

– выкарыстанне для самастойнай працы дыдактычных матэрыялаў і тэхнічных сродкаў навучання;

– фарміраванне ў школьнікаў навыкаў самакантролю;

– спосабы індывідуалізацыі і дыферэнцыравання заданняў для навучэнцаў у залежнасці ад іх асобасных і ўзроставых асаблівасцей і падрыхтоўкі;

– забеспячэнне паслядоўнасці ў самастойным ужыванні навучэнцамі ведаў, навыкаў і ўменняў падчас урока.

5. *Хатняе заданне:*

– падрыхтаванасць навучэнцаў да выканання хатняга задання;

– дыферэнцыяцыя і індывідуалізацыя хатніх заданняў навучэнцам;

– аб’ём і запланаваны час для выканання хатняга задання.

6. *Паводзіны навучэнцаў:*

– зацікаўленасць, стараннасць, дысцыплінаванасць навучэнцаў;

– метады ўцягвання школьнікаў у актыўную разумовую дзейнасць;

– матывацыя вучня на працягу ўсяго ўрока, асаблівасці выкарыстаных прыёмаў;

– стаўленне навучэнцаў да настаўніка.

7. *Паводзіны настаўніка:*

– уменне валодаць класам, арганізаваць яго працу, павялічваць актыўнасць, цікавасць, стаўленне да асобных навучэнцаў з улікам індывідуальных асаблівасцей;

– стыль і тон у працы, педагагічны такт;

– назіральнасць, знаходлівасць, эмацыянальны ўздым;

– аўтарытэт настаўніка.

8. *Вынікі ўрока:*

– высновы і прапановы. Дасягненне мэты. Выкананне плана;

– узровень і якасць ведаў навучэнцаў (свядомасць, глыбіня, трываласць);

– значэнне ўрока (выхаваўчае, адукацыйнае і якое развівае);

– інавацыі дадзенага ўрока, якія можна рэкамендаваць для ўкаранення ў практыку іншых настаўнікаў;

– парады і пажаданні настаўніку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Структурна-часавы аналіз урока.** Для навучання студэнта, маладога настаўніка рацыянальнаму выкарыстанню часу, асцярожнаму стаўленню да кожнай хвіліны ўрока варта выкарыстоўваць структурна-часавы яго аналіз. Пры гэтым звяртаецца ўвага на такія бакі ўрока:

– рацыянальнае размеркаванне ўсяго часу (45 мінут) паміж асобнымі элементамі ўрока, г.зн. ці разумна было ў дадзеных умовах вылучаць менавіта такі час на апытванне, на псіхалагічную падрыхтоўку да ўспрымання новага матэрыялу, на тлумачэнне новага, на замацаванне ці хатняе заданне;

– рацыянальнасць кожнага са структурных элементаў урока: якія яго элементы трэба было скараціць па часе, а якія павялічыць і для чаго менавіта;

– якаснае выкарыстанне часу на асобныя элементы ўрока (рацыянальны і эфектыўны час на апытанне пры вывучэнні новага матэрыялу, узровень працаздольнасці класа, колькі часу казаў настаўнік, навучэнцы);

– рацыянальнасць скарыстаных прыёмаў і метадаў навучання, г.зн. наколькі мэтазгодныя ў дадзеных умовах былі тыя ці іншыя формы апытання і самастойнай працы і г.д.;

– разумнасць сувязі паміж утрыманнем матэрыялу і тымі метадамі, з дапамогай якіх ён паведамляўся і засвойваўся.

**Аналіз і абагульненне перадавога педагагічнага вопыту:**

– вывучэнне і аналіз перадавога педагагічнага вопыту настаўнікаў- прадметнікаў, класных кіраўнікоў, аднакурснікаў;

– навучанне абагульненню асабістага вопыту дзейнасці;

– наведванне ўрокаў, калектыўных творчых спраў з наступным іх абмеркаваннем;

– вывучэнне розных кірункаў дзейнасці настаўнікаў-прадметнікаў і класных кіраўнікоў: методыка зносін з навучэнцамі розных узростаў, выхаванне дысцыплінаванасці школьнікаў на ўсіх этапах вучэбна-выхаваўчага працэсу, выбар адэкватных учынкам вучняў метадаў і сродкаў педагагічнага ўздзеяння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатак 3*

## Схема псіхолага-педагагічнага аналізу ўрока

1. Прозвішча, імя, імя па бацьку настаўніка.

2. Дата правядзення ўрока.

3. Змена, нумар урока па раскладзе.

4. Які ўрок па рахунку ў выкладчыка ў дадзены дзень.

5. Мэта ўрока.

6. Тып урока (камбінаваны, абагульненне, замацаванне ведаў, паўтор), яго структура.

7. Метады навучання, іх адпаведнасць узроставым і індывідуальным асаблівасцям навучэнцаў.

8. Метады апытання (франтальны, індывідуальны, групавы, самастойная праца, праца з карткамі, ужыванне ТСН, з выкарыстаннем адмысловых тэстаў і праграм).

9. Матывы вучэння (інтэлектуальныя, сацыяльна значныя і інш.).

10. Паводзіны настаўніка на ўроку (кантакт з класам, захопленасць, самавалоданне, знаходлівасць, уменне перабудоўваць працу на ўроку, залежнасць ад канспекта і праграмы).

11. Стыль зносін і працы настаўніка.

12. Характарыстыка пазнавальных працэсаў навучэнцаў падчас навучальнай дзейнасці на ўроку.

13. Характарыстыка якасці засваення ведаў: праца над паняццямі, вылучэнне галоўнага, засваенне тэорыі і яе сувязі з практыкай, фарміраванне перакананняў, дакладнасць ведаў.

14. Характарыстыка інтэлектуальнай атмасферы ўрока.

15. Развіццё настаўнікам пазнавальнай актыўнасці і інтарэсаў навучэнцаў.

16. Характарыстыка эмацыянальнай атмасферы ўрока: стаўленне навучэнцаў да працы на ўроку, дадатны, аптымістычны настрой на ўрок, уплыў эмацыянальнасці на працаздольнасць навучэнцаў, фарміраванне ў навучэнцаў адказнага стаўлення да вучэння.

17. Зацікаўленасць і захопленасць настаўніка сваёй прафесіяй.

18. Характарыстыка развіцця навучэнцаў падчас навучання: якія сістэмныя ўменні і навыкі былі набыты ці замацаваны, якія здольнасці пры гэтым развіваліся, якія маральныя якасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выхоўваліся падчас урока (адказнасць, арганізаванасць, самакантроль, самадысцыпліна, працавітасць, воля).

19. Выгляд, культура мовы, выразнасць невербальнага партрэта настаўніка.

20. Агульная ацэнка ўрока (дасягненне пастаўленай мэты, выніковасць урока, педагагічная абгрунтаванасць форм навучання, мэтазгоднасць методык і тэхналогій, рашэнне педагагічных сітуацый і задач падчас урока).

21. Рэкамендацыі па ўдасканаленні дзейнасці настаўніка, абагульненне яго вопыту з мэтай удасканалення сваёй працы на практыцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатак 4*

**Схема самааналізу ўласнай педагагічнай дзейнасці па педагагічнай практыцы**

студэнта(-кі) ____ курса______групы

Прозвішча_____________________________________________
Імя__________________________________________________

Практыку праходзіў у__________________________________
з ______ па _______
За час праходжання практыкі былі рэалізаваны наступныя віды педагагічнай дзейнасці:____________________________________
_____________________________________________________
Праз правядзенне______________________________________
Былі апрабаваны і ўжыты на практыцы наступныя сучасныя педагагічныя тэхналогіі:___________________________________
_____________________________________________________
Падчас педагагічнай практыкі былі набыты наступныя ўменні і навыкі:_____________________________________________
_____________________________________________________
На аснове самааналізу прыйшоў (-ла) да высновы аб паспяховасці сваёй педагагічнай дзейнасці ў далейшым пры рэалізацыі наступных умоў:_____________________________________
_____________________________________________________
Прапановы па арганізацыі практыкі________________________
_____________________________________________________
_____________________________________________________

Дата Подпіс практыканта

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатак 5*

## Анкета па выніках педагагічнай практыкі

1. Тэрміны праходжання практыкі, прадмет.

2. Дзе вы праходзілі практыку?

3. Што вам спадабалася ў дадзенай адукацыйнай установе?

4. Што вам не спадабалася ў дадзенай адукацыйнай установе?

5. Якую дапамогу аказваў вам кіраўнік практыкі ад адукацыйнай установы?

6. Якія вынікі вашай практыкі па методыцы выкладання прадмета?

7. Ацаніце па тыднях эфектыўнасць практыкі па методыцы выкладання, пакажыце віды працы (кансультацыі, распрацоўка заняткаў, наведванне ўрокаў):

1 тыдзень:____________________________________________

2 тыдзень:____________________________________________

3 тыдзень:____________________________________________

4 тыдзень:____________________________________________

8. У якой ступені вы выканалі ваша заданне па методыцы выкладання (пакажыце ў %)? Чаму?

9. Якую дапамогу вам аказваў кіраўнік практыкі па методыцы выкладання? (Назавіце прозвішча).

10. У якой ступені вы выканалі ваша заданне па педагогіцы (пакажыце ў %)? Чаму?

11. Якую дапамогу вам аказваў кіраўнік практыкі па педагогіцы? (Назавіце прозвішча).

12. Як вы ацэньваеце ўзровень арганізацыі практыкі?

13. Вашы прапановы па арганізацыі і правядзенні педагагічнай практыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатак 6*

## Схема аналізу з'яў мастацтва (тэатральнага спектакля, фільма, выстаўкі і г.д.)

1. Эмацыянальная рэфлексія: узнаўленне першапачатковай карціны вашага эмацыянальнага ўспрымання.

2. Змест твора і адэкватнасць яго адлюстравання, аналіз выразных сродкаў ва ўзаемасувязі з тэкстам твора.

3. Ідэйна-мастацкі сэнс твора (звышзадача мастака) і выразныя сродкі, выкарыстаныя для гэтага.

4. Стыль і стылеўтваральныя элементы твора: перадача светапогляднай пазіцыі аўтара і эпохі праз стыль.

5. Кантэкстны сэнс твора: твор у кантэксце творчасці аўтара, выканаўцаў, культуралагічным і інш. аспектах.

6. Абагульняльны вынік: з'ява мастацтва як элемент эстэтычнага вопыту студэнта, уплыў дадзенай з'явы на развіццё культурных інтарэсаў і патрэб студэнта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатак 7*

## Схема аналізу пазакласнага мерапрыемства

1. Дата і месца правядзення мерапрыемства, ініцыятар яго правядзення.

2. Тэма і выхаваўча-пазнавальная мэта правядзення мерапрыемства.

3. Форма правядзення мерапрыемства.

4. Адпаведнасць мерапрыемства выхаваўчым задачам вучнёўскага калектыву.

5. Чым забяспечвалася актыўнасць вучняў, як праявілася іх самастойнасць і ініцыятыва.

6. Характарыстыка мерапрыемства с пункта гледжання месца і часу яго правядзення, склад удзельнікаў мерапрыемства.

7. Ацэнка зместу і метадычных прыёмаў, выкарыстаных пры правядзенні мерапрыемства (мастацкія і навуковыя выступленні, выкарыстанне тэхнічных сродкаў).

8. Адносіны вучняў да мерапрыемства (зацікаўленасць ці абыякавасць).

9. Выхаваўчая каштоўнасць мерапрыемства.

10. Прапановы па ўдасканаленні методыкі падрыхтоўкі і правядзення пазакласных мерапрыемстваў у дадзеным вучнёўскім калектыве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатак 8*

## Схема псіхолага-педагагічнай характарыстыкі вучня

1. Агульныя звесткі пра вучня: імя і прозвішча, дата і месца нараджэння, узрост, прафесіі бацькоў, школа, клас, год навучання, класны кіраўнік.

2. Фактары развіцця і жыццёвыя ўмовы вучня:

– умовы выхавання ў сям'і: эканамічнае становішча ў сям'і, адукацыя членаў сям'і, культурны ўзровень, састаў і тып сям'і (поўная, няпоўная, складаная), сямейнае мікраасяроддзе вучня (месца вучня ў сям'і, узаемаадносіны з бацькамі, братамі і сёстрамі, бабулямі і дзядулямі, іншымі сумесна пражываючымі роднымі);

– пазасямейныя і пазашкольныя ўздзеянні: арганізаваныя (удзел у гуртках, факультатывах, секцыях) і неарганізаваныя (сябры, заняткі ў вольны час, захапленні).

3. Знешні выгляд асобы:

– праявы: фізічнае аблічча, знешні выгляд, прыкметныя дэталі, рухальныя асаблівасці, пантаміміка, моўныя асаблівасці, дыкцыйныя навыкі, моўныя паводзіны (змест і культура мовы, моўная актыўнасць), індывідуальныя асаблівасці почырку, сталасць і арганізаванасць пісьма;

– манера паводзін: асноўныя рысы паводзін (актыўнасць – пасіўнасць, арганізаванасць – хаатычнасць і інш.), адносіны да самога сябе (да свайго цела, здароўя, знешнасці, недахопаў і пераваг, здольнасцей і схільнасцей, асобасных і прафесійных перспектыў, адносіны да асабістых рэчаў), паводзіны ў адносінах да іншых (становішча ў навучальным калектыве, адносіны з настаўнікамі, выхавацелямі, бацькамі), дзейнасць у псіхалагічна складаных сітуацыях (выбар, канфлікт, публічнае выступленне), паводзіны ў адносінах да сродкаў выхавання, рэакцыя на ўздзеянні калектыву (паслухмянасць, самастойнасць, канфліктнасць і інш.), рэакцыя на высокую ці нізкую ацэнку настаўніка.

4. Асаблівасці характару вучня: ярка выражаныя станоўчыя ці адмоўныя рысы характару (пачуццё абавязку, арганізаванасць, настойлівасць, чуласць ці эгаізм, неарганізаванасць, замкнёнасць і інш.), пераважны настрой (вясёлы, сумны, прыгнечаны і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. Характарыстыка эмацыянальна-валявой сферы асобы: узровень эмацыянальнай узбуджальнасці, хуткасць працякання і змены эмоцый, моц і глыбіня перажыванняў, эмацыянальная ўстойлівасць у складаных сітуацыях, мэтанакіраванасць, настойлівасць, ініцыятыўнасць, уменне кіраваць эмацыянальнымі працэсамі (як сваімі, так і іншых).

6. Характарыстыка пазнавальных працэсаў: асаблівасці ўспрымання (шырыня, глыбіня, аб'ектыўнасць), асаблівасці ўвагі (адвольнасць, хуткасць пераключэння, выбіральнасць), асаблівасці памяці (асноўны тып памяці, працягласць), уяўленне (хуткасць, актыўнасць, творчы характар), асаблівасці мыслення (хуткасць, валоданне лагічнымі дзеяннямі, пераважнасць творчага або лінейнага мыслення), моўны запас і характар яго выкарыстання.

7. Асаблівасці вучэбнай дзейнасці: паспяховасць заняткаў па розных групах вучэбных дысцыплін, уменне вучыцца і імкненне навучыцца, пераважныя матывы вучэння, параўнальная актыўнасць на занятках па прадметах розных груп вучэбных дысцыплін, ацэнка здольнасцей настаўнікамі.

8. Агульныя псіхолага-педагагічныя вывады:

– асноўныя перавагі і недахопы асобы вучня, прычыны, што іх выклікаюць;

– што можна зрабіць, каб спрыяць гарманічнаму развіццю асобы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатак 9*

*Тытульны ліст справаздачы пераддыпломнай практыкі*

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Справаздача
пераддыпломнай практыкі
з _______ па _______
у ____________________________

Студэнта (-кі):_____________
(прозвішча, імя, імя па бацьку)
Кіраўнік:__________________
(прозвішча, імя, імя па бацьку)

Мінск 20XX

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ПРАГРАМА**
**ВУЧЭБНАЙ І ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫКІ**

*па спецыяльнасці 1-21 04 01 Культуралогія,*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-01 Культуралогія (фундаментальная), спецыялізацыі 1-21 04 01-01 01 Тэорыя і гісторыя культуры*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2013. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,69. Ул.-выд. арк. 0,94. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ